# ВОДЗЫЎ

аб аўтарэфераце дысертацыі С.В. Панова
«Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і
адукацыі

Аўтарэферат дысертацыі С.В. Панова адлюстроўвае на свайму зместу гісторыка-педагагічны характар даследавання, што адпавядае заяўленай спецыяльнасці. Школьная гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь, якая з'яўляецца аб'ектам даследавання, вызначаецца суіскальнікам як комплексная педагагічная сістэма. Суіскальнік дае характарыстыку канцэптуальным асновам развіцця школьнай гістарычнай адукацыі як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы. Такі комплексны падыход да вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі лагічна рэалізуецца далей, аб чым сведчыць змест аўтарэферата. Суіскальнікам выяўлены тэндэнцыі, якія сведчаць аб паступовай змене канцэптуальнага мэтавызначэння ад прадметацэнтрызму да арыентаванасці на развіццё асобы; аб актуалізацыі такіх прынцыпаў абнаўлення зместу, як прынцыпы антрапалагізацыі, культурна-гістарычнага асяроддзя, гістарычнай дыялагічнасці; аб цыклічнасці пры ажыццяўленні канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу; аб пераемнасці ў рэалізацыі культуралагічнага і кампетэнтнаснага падыходаў.

Сканструяваная суіскальнікам мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі мае дастаткова універсальны характар адносна даследавання падобных ёй шматфактарных і шматкампанентных педагагічных сістэм. Суіскальнікам удакладнены канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі з адпаведнымі ім фактарамі. Сярод іх варта адзначыць дзяржаўную гістарычную палітыку ў галіне школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Фарміраванне нацыянальна-арыентаванага кантэнта школьнай гістарычнай адукацыі абумоўліваецца, па меркаванні суіскальніка, накіраванасцю дзяржаўнай гістарычнай палітыкі на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. Адсюль і выяўленне перспектывы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, арыентаванай на рэалізацыю нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі як вучэбнага прадмета ў працэсе фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў і інтэграцыі гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Прыкметай гуманітарнага характара даследавання з'яўляецца разгледжанне суіскальнікам школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы. Спецыфіка вывучэння школьнай гістарычнай адукацыі, вызначаная суіскальнікам, заключаецца ў спалучэнні метадалагічных асаблівасцей гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі і метадалагічных прынцыпаў гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай

навукі. У аспекце гуманітарызацыі суіскальнік даследуе тэарэтычнае вызначэнне прадстаўнікамі сучаснага беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства. Суіскальнікам вывучаецца рэалізацыя дадзеных канцэптаў у змесце школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі.

Сведчаннем гуманітарызацыі даследавання з’яўляецца вызначэнне суіскальнікам культуралагічнай канцэпцыі зместу адукацыі ў якасці метадалагічнай асновы для пазіцыяніравання зместу школьнай гістарычнай адукацыі як сацыяльнага вопыту чалавецтва, у т.л. беларускага народа, які трансліруецца ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі.

Асаблівую цікавасць выклікае вызначэнне суіскальнікам канцэпту традыцыйных каштоўнасцей, агульнапрынятых у сучасным беларускім грамадстве. Як сцвярджае суіскальнік, дадзены канцэпт прадстаўлены ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі праз канкрэтныя прыклады сацыяльных паводзін прадстаўнікоў беларускай нацыі ў гісторыі, рэгулятарамі паводзін якіх сталі традыцыйныя каштоўнасці. Дадзеныя каштоўнасці ўлічваюцца ў працэссе канструявання сацыяльна-аксіялагічнага зместу школьнай гістарычнай адукацыі. Суіскальнікам у аўтарэфераце згадваюцца даследаванні каштоўнасных арыентацый беларускай вучнёўскай моладзі пад кіраваннем Д.Г. Ротмана, а таксама даследаванне асобаснага развіцця і ўзроўню выхаванасці вучняў IX, XI класаў, праведзенае Нацыянальным інстытутам адукацыі (І.П. Жаголь-Лабзеева). Было б лагічным прадставіць у аўтарэфераце іерархію каштоўнасных арыентацый вучняў, тым больш, што яны згадваюцца, напрыклад, у артыкуле суіскальніка «Патриотическое воспитание белорусской учащейся и студенческой молодежи: социально–педагогическое моделирование» у часопісе «Вышэйшая школа».

Актуальнасць аўтарскага даследавання абумоўлена ажыццяўленнем Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг., а таксама рэалізацыяй светапоглядна-выхаваўчай функцыі школьнай гістарычнай адукацыі. Варта заўважыць, што з удзелам суіскальніка распрацавана ахарактарызаваная ў аўтарэфераце сацыяльна-педагагічная мадэль патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі.

Звяртае на сябе ўвагу сацыяльная значнасць даследавання, звязаная з фарміраваннем у вучняў гістарычнай памяці як інтэгратыўнай якасці асобы праз комплекснае прадстаўленне культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі, прыкладаў учынкаў прадстаўнікоў беларускай нацыі, якія ў гістарычнай рэтраспектыве сведчаць аб іх нацыянальнай самасвядомасці і адпавядаюць намінатыўнай маркерызацыі «Нацыянальны герой» разам з існуючай у вучэбнай літаратуры намінацыяй «Нашы славутыя землякі». Дарэчы і прыведзеныя ў аўтарэфераце вынікі анкетавання суіскальнікам эмацыянальна-каштоўнасных адносін настаўнікаў гісторыі да прадстаўнікоў беларускай нацыі і гістарычных падзей 1917 г. – пачатку XXI ст.

Аўтарам даследавання, як сведчыць аналіз аўтарэферата, распрацавана перыядызацыя працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь з улікам рэалізацыі на сучасным этапе Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь 2022 г., у стварэнні якой суіскальнік прымаў удзел.

Варта адзначыць вялізарны ўнёсак суіскальніка ў распрацоўку тэмы даследавання, бо ён з'яўляецца сааўтарам 19 вучэбных дапаможнікаў па вучэбным прадмеце «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь», сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Афармленне аўтарэферата адпавядае «Інструкцыі аб парадку афармлення кваліфікацыйнай навуковай работы (дысертацыі) на атрыманне вучоных ступеняў кандыдата і доктара навук, аўтарэферата і публікацый па тэме дысертацыі», зацверджанай пастановай Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 22 жніўня 2022 г. № 5.

Азнаямленне з тэкстам аўтарэферата пазваляе сцвярджаць, што суіскальнікам дасягнута мэта дысертацыйнага даследавання, звязаная з вызначэннем і абгрунтаваннем канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі. Для гэтага былі прааналізаваны тры пакаленні канцэпцый, тры пакаленні адукацыйных стандартаў, змест пяці пакаленняў школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры, вывучана афармленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, структураванне зместу адукацыі па канцэнтрычным і лінейным прынцыпах, сістэматызаваны рэалізаваныя ў школьнай гістарычнай адукацыі агульнапедагагічныя, акадэмічна-гістарычныя і прадметна-гістарычныя падыходы.

Вывучэнне зместу аўтарэферата дысертацыі С.В. Панова «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» дазваляе зрабіць выснову аб адпаведнасці навуковай кваліфікацыі суіскальніка ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Прафесар кафедры педагогікі і псіхалогіі
установы адукацыі
«Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт»,
доктар педагагічных навук, прафесар Т.А. Лапацік

Рэспубліка Беларусь Установа адукацыі «Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт» г. Мінск

Учреждение образования
"МИНСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ЛИНГВИСТИЧЕСКИЙ УНИВЕРСИТЕТ"
Подпись Лопатик Т.А
УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник отдела кадров МГЛУ
( П.П.Новиков )
«14» 07 2025 г.